Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 31 (643)
ПЯТНІЦА
21
кастрычніка
1966 года
Год выдання XIX

цана 2 кап.

*НАСУСТРАЧ 50-ГОДДЗЮ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ*

## АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ГІСТОРЫКАЎ ФІЛАСОФІІ

**Як ужо паведамлялася, на факультэтах у гэтыя дні распрацоўваюцца і зацвярджаюцца сацыялістычныя абавязацельствы ў гонар 50-годдзя Савецкай улады. Вялікія абавязацельствы ўзялі на сябе члены кафедры гісторыі філасофіі і логікі. Імі выразшана да 7 лістапада 1967 года выпусціць у свет вучэбны дапаможнік для студэнтаў «Асновы навуковага камунізма», падрыхтаваць для выдання вучэбна-метадычны дапаможнік па эстэтыцы, а таксама сістэматычна абмяркоўваць тэксты лекцый і адкрытыя лекцыі, каб палепшыць навучальны працэс па ўсіх выкладаемых дысцыплінах.**

**Акрамя таго, будуць выданы манаграфіі кандыдата філасофскіх навук С. Д. Лапцёнка «Мараль і сям'я» і кандыдата філасофскіх навук В. А. Молакава «Крытыка філасофскіх асноў сучаснага праваслаўя». Рыхтуюцца да друку навуковыя даследаванні дацэнтаў С. А. Кляўчэні, М. І. Крукоўскага, старшага выкладчыка М. В. Рожына, а таксама зборнік выбраных твораў мысліцеляў Беларусі XIX стагоддзя. Пад кіраўніцтвам прафесара, доктара філасофскіх навук М. І. Лушчыцкага пачалася работа па падрыхтоўцы да выдання вялікай калектыўнай працы «Гісторыя філасофіі і сацыялогіі ў Беларусі (XVI—XIX стагоддзяў)». Мяркуецца I том надрукаваць да 50-годдзя БССР.**

**У абавязацельствах гісторыкаў філасофіі шмат пунктаў аб удзеле ў прапагандысцкай рабоце ва універсітэце і рэспубліцы, аб паляпшэнні падрыхтоўкі кваліфікаваных спецыялістаў.**

## ЛЕТАПІС НАШЫХ ПОСПЕХАЎ

**Рэктарат прыняў пастанову правесці на ўсіх факультэтах і кафедрах работу па складанню кнігі «Беларускі дзяржаўны універсітэт да 50-годдзя Савецкай улады». У склад рэдакцыйнай калегіі ўвайшлі А. Н. Сеўчанка (старшыня), А. Я. Малышаў, В. І. Сцяпанаў, Л. В. Валадзько, П. С. Абэцэдарскі, В. М. Сікорскі і С. А. Умрэйка.**

## СПАБОРНІЦТВА УНІВЕРСІТЭЦКІХ ТАЛЕНТАЎ

**У сувязі з правядзеннем Усесаюзнага фестывалю мастацкай самадзейнасці, прысвечанага 50-годдзю Савецкай улады, партыйны камітэт пастанавіў арганізаваць агляд універсітэцкіх самадзейных мастацкіх калектываў. Вызначаны наступныя тэрміны: гістарычны і фізічны факультэты—у суботу 3 снежня; хімічны і матэматычны—у нядзелю 4 снежня; юрыдычны і біялагічны—у панядзелак 5-га снежня; геаграфічны і філалагічны—у аўторак 6 снежня.**

**Для правядзення агляду створана журы ў складзе: А. Я. Малышаў (старшыня) — прарэктар па вучэбнай рабоце, А. А. Волк—намеснік сакратара парткома, С. А. Лысенка—член парткома, І. Т. Рагоўскі—старшыня мясцкома, М. А. Лісіцын—кіраўнік народнага аркестра, Л. К. Аляксютовіч—кіраўнік танцавальнага калектыву, А. І. Білібін—кіраўнік Народнай харавой капэлы, А. Д. Вайнтштэйн—кіраўнік эстраднага аркестра, В. М. Бараноўскі — кіраўнік духавога аркестра, М. Д. Ціва—намеснік сакратара камітэта камсамола, В. Д. Літвінка—старшыня праўлення клуба, В. З. Рабушка—старшыня прафкома.**

**На пасяджэнні парткома адзначалася, што неабходна звярнуць увагу на падрыхтоўку разнастайных нумароў самадзейных артыстаў, у прыватнасці, мастацкага чытання на беларускай мове, арыгінальных жанраў, фізкультурных выступленняў.**

# ТВОЙ КАМСАМОЛЬСКІ БІЛЕТ




За апошнія гады, выконваючы рашэнні XXII—XXIII з'ездаў КПСС і свае пастановы, Усесаюзны Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі дабіўся вялікіх поспехаў у рабоце, у развіцці ініцыятывы радавых камсамольцаў. XV з'езд камсамола значна расшырыў правы і сферу дзеяння пярвічных камсамольскіх арганізацый, яго рашэнні стварылі лепшыя ўмовы для практычнага ажыццяўлення дэвізу: дапамагаць кожнаму камсамольцу прайсці палітычную і практычную загартоўку маладога ленінца.

Зараз камсамол—напярэдадні новага значнага арганізацыйна-палітычнага мерапрыемства, накіраванага на ўмацаванне радоў ВЛКСМ, павышэнне актыўнасці і самадзейнасці кожнага камсамольца. З 1 студзеня 1967 года па рашэнню XV з'езда камсамола пачнецца абмен камсамольскіх дакументаў. У сувязі з гэтым 12 кастрычніка «Комсомольская правда» надрукавала рэдакцыйны артыкул. У ім, у прыватнасці, гаворыцца:

«Хутка ўсе члены ВЛКСМ у райкоме, гаркоме, камітэце камсамола атрымаюць камсамольскі білет новага ўзору. Колер яго вокладкі, быццам водбліск чырвонага полымя баявых сцягоў Вялікага Кастрычніка. Сілуэт Леніна на ім—як сімвал вернасці камсамольца справе і запаветам Леніна. 5 ордэнаў на развароце—як прызнанне заслуг 23-мільённай камсамоліі—памочніка і рэзерва Камуністычнай партыі».

Абмен камсамольскіх дакументаў будзе праводзіцца ў год 50-годдзя Савецкай улады. Рыхтуючыся да гэтай знамянальнай даты, атрымоўваючы новы камсамольскі білет, кожны павінен даказаць сваёй працай, вучобай, грамадскімі справамі права быць у камсамоле. Неабходнасць абмена камсамольскіх дакументаў выклікана аб'ектыўнымі прычынамі. Дастаткова сказаць, што толькі паміж XIV і XV з'ездамі ВЛКСМ у саюз уступіла звыш 15 мільёнаў юнакоў і дзяўчат. Бурны рост камсамола, павышэнне яго аўтарытэту, удасканальванне арганізацыйнай работы—усё гэта і многае іншае патрабуе ўзмацніць кантроль за выкананнем даручэнняў, паляпшэння ўсебаковага кіраўніцтва. Патрэбна навесці парадак ва ўліку камсамольцаў, у запісах і адзнаках у іх дакументах.

У новыя дакументы ўводзіцца спецыяльная графа, дзе будуць адзначацца грамадскія даручэнні членаў ВЛКСМ. Гэта дапаможа паўней характарызаваць аблічча камсамольца, узмацніць адказнасць кожнага перад арганізацыяй за выкананне яе наказаў.

«Абмен камсамольскіх білетаў,—адзначаецца ў артыкуле,—гэта не механічная замена старых камсамольскіх білетаў і ўчотных картак на бланкі новага ўзору, а перш за ўсё агляд радоў ВЛКСМ, праверка арганізаванасці, дысцыпліны, актыўнасці кожнага нашага таварыша па саюзу. Рыхтуючыся да абмену камсамольскіх дакументаў, камсамольскія камітэты і пярвічныя арганізацыі саюза павінны праявіць да кожнага камсамольца максімум увагі, чуласці».

Вялікія задачы стаяць і перад камсамольскай арганізацыяй універсітэта. У першую чаргу трэба навесці парадак ва ўліку членаў ВЛКСМ. Не сакрэт, што некаторыя выпускнікі па розных прычынах выязджаюць на працу не зняўшыся з уліку. Ёсць выпадкі, калі паступіўшыя ва універсітэт студэнты падоўгу не становяцца на ўлік. Але галоўнае ў тым, каб ва ўсёй рабоце пазбавіцца ад паспешлівых рашэнняў, павысіць таварысцкую патрабавальнасць за выкананне Статута ВЛКСМ усімі, хто звязаў свой лёс з нашым саюзам.

У заключных радках «Комсомольская правда» піша: «Ва ўсёй рабоце па падрыхтоўцы да абмену камсамольскіх дакументаў вельмі важна абапірацца на падтрымку і параду партыйных арганізацый, камуністаў. Гэта дапаможа пазбегнуць памылак, арганізавана правесці важную палітычную кампанію ВЛКСМ, якая павінна стаць дэманстрацыяй адзінства і згуртаванасці камсамольскіх радоў, яшчэ адным сведчаннем вернасці моладзі справе партыі».

# ТРАДЫЦЫЙНЫ СТУДЭНЦКІ

*У верасні 1954 года па ініцыятыве ЦК камсамола Беларусі быў арганізаваны першы Дзень мінскага студэнта. Гэтае цікавае свята моладзі адзначалася яшчэ некалькі разоў, але потым чамусьці наступіў перапынак. І вось у мінулую нядзелю тысячы студэнтаў сталіцы рэспублікі і запрошаныя з іншых гарадоў госці запоўнілі вуліцы і Цэнтральную плошчу Мінска.*

*Свята Дня студэнта ўзрадзілася на новай аснове і, канешне, прайшло больш цікава. Пасля ўрачыстага адкрыцця (дарэчы, ў гэтым прынялі ўдзел прынцэса Стыпендыя, бабуля Лекцыя, прыгажуня Шпаргалка, зладзейка Сесія, граф Семінар і бог Навукі) пачалося грандыёзнае факельнае шэсце. Чатырыста юнакоў і дзяўчат неслі факелы, запаленыя ад вечнага агню ля помніка Перамогі. Шэсце накіроўваецца да плошчы Леніна. Тут, ля помніка Ільічу, адбыўся ўрачысты мітынг, які адкрыў сакратар Мінскага гаркома камсамола Анатоль Рагузін. Ён прадастаўляе слова доктару юрыдычных навук, прафесару БДУ А. В. Дулаву, затым выступаюць студэнтка нашага універсітэта Нэля Крывашэева, прадстаўніца мединстытута Людміла Пляшкевіч.*

*Да падножжа помніка Ул. І. Леніну кладуцца жывыя кветкі. На мітынгу прымаецца зварот Мінскага студэнцтва да ўсіх студэнтаў рэспублікі. Першы заклік гучыць паленінску: «Вучыцца, вучыцца і яшчэ раз вучыцца!» Студэнты сталіцы вырашылі ўвекавечыць памяць камсамольцаў—мінчан, загінуўшых у час Вялікай Айчыннай вайны, узяць шэфства над будаўніцтвам, стварыць новыя стадыёны, басейны, спартыўныя пляцоўкі, новыя паркі, скверы і алеі. «Верны сваім традыцыям студэнцкі камсамол Мінска аддасць усе сілы і энергію, каб моладзь Краіны Саветаў заўсёды, у любым выпрабаванні была дастойна легендарнай, бессмяротнай славы сваіх бацькоў» — гаворыцца ў звароце.*

*Студэнты Мінска заклікалі ўсіх сваіх сяброў у рэспубліцы ўсебакова рыхтавацца да слаўнага юбілея — 50-годдзя Савецкай улады з тым, каб сустрэць гэта свята новымі поспехамі ў вучобе, у грамадскай дзейнасці і ў працы на карысць Радзіме. У выкананні сацыялістычных абавязацельств, якія цяпер распрацоўваюцца і зацвярджаюцца ў ВНУ, свае слова павінны сказаць і студэнты.*

*Да подняга вечару працягвалася святкаванне, яно прадоўжылася і ў інстытутах, дзе адбыліся сустрэчы па інтарэсах.*

*На здымках нашага фотакарэспандэнта А. Кадзета вы бачыце эпізоды студэнцкага свята.*








*Здаецца, зусім нядаўна я пазнаёміўся з студэнтам фізічнага факультэта Вадзем Лузавым. З таго часу мінула чатыры гады. Для яго яны былі гадамі напружанай і стараннай працы. Пройдзе яшчэ адзін год і краіна атрымае выдатнага спецыяліста-фізіка.*

Фота і тэкст А. Кадзета.

Партыйнае жыццё

# ДЗЕЛАВІТАСЦЬ У САЮЗЕ З КРЫТЫКАЙ

Закончыліся справаздачы і выбары ў пярвічных партыйных арганізацыях нашага універсітэта. Сёлета яны праходзілі выключна актыўна і падзелавому. Пад уплывам рашэнняў XXIII з'езда КПСС камуністы, студэнты і выкладчыкі з вялікай заклапочанасцю аб паляпшэнні вучэбна-выхаваўчага працэсу на ўсіх факультэтах падагульняюць усё тое становучае, што накаплялася ў партыйнай рабоце за справаздачны перыяд, прынцыпова крытыкавалі недахопы, работу асобных членаў бюро і камуністаў. Аб чым, як не аб прынцыповасці і жаданні палепшыць работу, сведчыць, напрыклад, той факт, што на філалагічным факультэце ў спрэчках выступіла 14 камуністаў.

Вялікую прынцыповасць праявілі камуністы пры выбары членаў партыйных бюро. Усяго ў састаў партыйнага бюро выбрана больш 80 дзелавых і аўтарытэтных, ведаючых партыйную работу камуністаў. На філалагічным, юрыдычным, хімічным фізічным факультэтах выбраны новыя сакратары партыйных бюро. Гэта С. А. Гусак, П. А. Дубавец, П. П. Сіліванчык, С. А. Кіслякоў.

Кожны факультэт мае свае асаблівасці, свае задачы. Яны адлюстраваны ў прынятых пастановах на справаздачна-выбарчых сходах. Задача заключаецца зараз у тым, каб да канца выканаць гэтыя пастановы, ліквідаваць усе адзначаныя недахопы, умела накіраваць грамадскую дзейнасць кожнага члена і кандыдата партыі на выкананне нядаўняй пастановы партыі і ўрада «Аб мерах па паляпшэнню падрыхтоўкі спецыялістаў і ўдасканаленню кіраўніцтва вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй у краіне».

Але справаздачна-выбарная кампанія яшчэ не закончана. Наперадзе агульнауніверсітэцкі справаздачна-выбарчы партыйны сход. Да яго трэба дэталёва падрыхтавацца кожнаму камуністу. Падрыхтавацца ў тым сэнсе, каб падвесці вынікі работы за год, выявіць усё становучае з мэтай выкарыстання яго ў будучай рабоце, а галоўнае, каб і тут дзелавітасць ішла побач з вострай крытыкай, каб былі ўскрыты усе недахопы і заганы ў нашай рабоце. Усё гэта будзе садейнічаць павышэнню авангарднай ролі партыйных арганізацый у справе камуністычнага будаўніцтва.

Ул. БЛАКІТНЫ.

Камсамольскае жыццё

# НА ГАЛОЎНЫМ НАПРАМКУ

Штогод справаздачна-выбарчы камсамольскі сход на філалагічным факультэце праходзіць у нейкіх святочных і ўрачыстых абставінах. Так было і на гэты раз. У калідорах і актавай зале — стэнды, насценныя газеты, лісткі «КП», розныя плакаты. Усё гэта дапамагае камсамольцам прысці на сход з поўнымі думкамі аб рабоце камсамольскай арганізацыі за год. І справаздача камітэта камсамола пачынаецца фактычна яшчэ задоўга да выступлення сакратара камітэта камсамола Анатоля Гарбачова, які ўручае Ганаровыя Граматы і значкі лепшым камсамольцам факультэта, тым, хто працаваў на цалінных будоўлях Уральскай вобласці, у Сібіры, у Забайкальскай тайзе, у Ташкенце, у Беларусі.

Камітэт камсамола, увесь актыў факультэта прыкладвалі шмат намаганняў для таго, каб уцягнуць як мага больш камсамольцаў у актыўную работу, у выніку чаго, каля 500 камсамольцаў мелі грамадскія даручэнні. Але гэта не дало нам магчымасці пазбегнуць падзелу на «актыў» і «пасіў». Нярэдка можна сустрэць і такіх камсамольцаў, якія жывуць толькі для сябе, стаяць у баку ад грамадскага жыцця.

За справаздачны перыяд камсамольская арганізацыя факультэта зрабіла многа карыснага. Так, напрыклад, упершыню быў арганізаваны «Клуб вынаходлівых»; літаратурная група пад кіраўніцтвам Анатоля Ганчарова часта выступала са сваімі вершамі на факультэце, на заводах, фабрыках, калгасах, саўгасах, у школах сталіцы. Слухачам добра запамяталіся вершы маладых паэтаў Леаніда Дайнекі, Мар'яна Дуксы, Сяргея Законнікава, Міхася Губернатарава і іншых. Рэгулярна выходзіла насценная газета «Слова філолага», якая на універсітэцкім аглядзе заняла першае месца сярод факультэцкіх газет. «КП» філфака выходзіў з яркімі ілюстрацыямі і здымкамі, якія крытыкавалі тых студэнтаў, што дрэнна вучацца, спазняюцца на лекцыі, пасіўнічаюць на семінарскіх занятках.

Добра працавалі на факультэце навуковыя гурткі. Іх было 11. За мінулы год яго ўдзельнікамі было падрыхтавана і прачытана каля 80 дакладаў. Лепшым лічыцца гурток рускай савецкай літаратуры (староста В. Сіманава).

За справаздачны перыяд камітэту камсамола прыйшлося разабраць 48 асабістых спраў камсамольцаў. Гэта гаворыць аб тым, што за справаздачны перыяд не былі поўнасцю зжыты выпадкі амаральных паводзін студэнтаў. Дзмітрый Фалітар, напрыклад, за п'янку адседзеў дзесяць сутак у выцвярэзніку. Гэта вельмі непрыемны факт.

Актыўна выступалі камсамольцы ў спрэчках па дакладу.

Ларыса Краўчанка гаварыла аб тым, што студэнтам-філолагам неабходна яшчэ больш праявіць ініцыятыву для арганізацыі культурных вечароў, цікавых сустрэч. А то здараецца і так, што на дамоўленую сустрэчу прыходзяць сем пісьменнікаў і сем студэнтаў.

Віктар Поляк закрануў такое ж пытанне, калі гаварыў пра выпуск газет і стэндаў на факультэце. Ён адзначыў, што многія нумары рыхтаваліся толькі сіламі рэдкалегіі. Паўстае пытанне, дзе ж былі астатнія журналісты і філолагі? Яны, відаць, безнадзейна «штурмавалі» рэдакцыі рэспубліканскіх газет.

Дэкан факультэта Р. В. Булацкі адзначыў, што за апошнюю сесію павялічылася колькасць выдатнікаў, але і павялічылася колькасць хвасцістаў. Першага верасня ў аўдыторыю зайшло 184 студэнты, якія атрымалі за летнюю сесію двойкі і незалікі. Так, што вынікі не вельмі прыемныя і зрухаў пакуль што не відаць. Р. В. Булацкі гаворыць, што гэтым пытаннем камітэт камсамола і актыў удзялялі яшчэ недастаткова ўвагі. Так атрымліваецца і цяпер: кабінеты і бібліятэкі усё яшчэ пусцеюць, студэнты мала думаюць пра сесію. Новавыбраны камітэт павінен зрабіць усё, каб паспяховасць была адной з галоўных задач у дзейнасці камсамольскай арганізацыі.

У камітэт абрана 21 камсамолец. І гэта правільна: факультэцкая арганізацыя філфака за апошні год значна вырасла.

Сакратаром стала Оля Буланчыкава, энергічны і вопытны актывіст. Хочацца верыць, што новы камітэт, уся камсамольская арганізацыя будуць і надалей падтрымліваць і развіваць лепшыя традыцыі, дасягнутыя факультэтам за мінулыя гады.

С. КАРАНЕЦ.

# ШКОЛА КУЛЬТУРЫ

**СУПРАЦОЎНІКАМ** падрыхтоўчага факультэта для замежных грамадзян, які існуе ва універсітэце ўжо шосты год, добра вядома дапытлівасць юнакоў і дзяўчат, якія штогод прыязджаюць да нас на вучобу з краін Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі.

Першыя гады на факультэце праводзіліся вечары пытанняў і адказаў. Але час ішоў, адбываліся вялікія змены ў жыцці народаў тых краін і на тых кантынентах, адкуль прыязджалі да нас студэнты. Разам з гэтым расла і свядомасць, грамадзянская актыўнасць замежнай моладзі, яе дапытлівасць да гісторыі рэвалюцыйных падзей у нашай краіне, да практыкі будаўніцтва сацыялізма і камунізма ў СССР. Не дзіўна, што ў студэнтаў часта ўзнікалі такія складаныя і глыбокія пытанні, адказаць на якія было цяжка. Неабходнасць адкрыць школу культуры на факультэце падказала само жыццё. І яна стала працаваць яшчэ з мінулага года.

Калі бліжэй пазнаёміцца з работай школы культуры, адразу ж кідаецца ў вочы творчы падыход да кожнай тэмы яе заняткаў. Тут бываюць лекцыі, даклады, проста задушэўныя гутаркі, адказы на пытанні, сустрэчы з жывымі сведкамі падзей, са стваральнікамі самога жыцця. Нярэдка заняткі нават пераносяцца па-за сцены падрыхтоўчага факультэта ў памяшканне Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі, у Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, на прадпрыемствы.

Па розных пытаннях у мінулым годзе з замежнымі гасцямі сустракаліся і гутарылі намеснік Міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. І. Красоўскі, рэктар універсітэта прафесар А. Н. Сеўчанка. Частымі гасцямі ў студэнтаў былі супрацоўнікі савецкіх органаў, кіраўнікі грамадскіх арганізацый, камсамола.

Вялікую дапамогу ў рабоце школы пастаянна аказвала таварыства «Веды», якое ўзначальвае дацэнт М. Я. Рэзнікаў. З цікавымі лекцыямі аб міжнародным становішчы выступаў перад замежнымі студэнтамі дацэнт М. Р. Круцько. Яго слухалі студэнты з асаблівай увагай, задавалі шмат пытанняў, запрашалі часцей наладжваць чытанне такіх лекцый. Цыкл гутарак і лекцый на антырэлігійныя, атэістычныя тэмы прачытаў прафесар Г. М. Ліўшыц.

Прафесар В. Г. Заўрыеў пабываў у В'етнаме. Таму зразумела, з якой нецярплівасцю чакалі яго і з якім захапленнем студэнты розных краін слухалі жывы расказ аб шматпакутнай зямлі, працавітым і мужным В'етнаме. Удзячнымі засталіся слухачы дацэнтам С. А. Умрэйку, М. І. Крукоўскаму, Г. А. Павеццеву, старшаму выкладчыку А. В. Куцэнка, прафесару Л. С. Абэцэдарскаму і многім іншым супрацоўнікам універсітэта.

Значнае месца ў плане работы школы культуры адводзіцца тэме Вялікай Айчыннай вайны. На факультэце стала традыцыяй выязджаць у канцы навучальнага года ў Брэсцкую крэпасць-герой, праводзіць экскурсіі па месцах партыйнага падполля ў гады вайны, у Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Падабаецца замежным студэнтам і прагляд такіх кінафільмаў, як «Гадзіннік спыніўся апоўначы», «Балада аб салдаце», «Дзяўчынка шукае бацьку» і іншыя. Неаднаразова наладжваліся незабыўныя сустрэчы з Героямі Савецкага Саюза, падпольшчыкамі, партызанамі. Нашы выпускнікі розных гадоў добра ведаюць удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны П. М. Гаўрылава, А. В. Кірсанава, М. Б. Осіпаву, Е. Г. Мазанік Е. М. Канапліна, А. А. Філімонава, М. Ц. Нечыпарэнку, Р. П. Лучанка. Гэта яны ў мільённых шэрагах бясстрашных, мужных байцоў адстайвалі свабоду, светлае будучае не толькі сваёй краіны, але і ўсяго чалавецтва.

Сёлета на вучобу прыехала звыш паўтараста студэнтаў з В'етнама і краін Афрыкі. І хоць не прайшло яшчэ і двух месяцаў вучобы ў Савецкім Саюзе, але замежныя студэнты ўжо шмат чаго даведаліся аб нашай краіне. У гэтым немалая заслуга як выкладчыкаў, усіх супрацоўнікаў факультэта, так і школы культуры. Перад замежнымі сябрамі ўжо выступілі на сустрэчах Старшыня Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР В. С. Смірноў, былы камандзір Магілёўскага партызанскага злучэння С. Г. Сідарэнка-Салдаценка, сакратар камітэта камсамола універсітэта Г. Я. Рылюк. Намеснік дэкана факультэта М. С. Мяцельскі прачытаў лекцыю аб рэвалюцыйных падзеях у Мінску ў перыяд Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, дацэнт В. А. Навіцкі аб развіцці прамысловасці рэспублікі за гады Савецкай улады. На чарговых занятках старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання В. С. Хрэнаў расказаў замежным сябрам аб развіцці спорту ў СССР, ва універсітэце, а ўрач Ф. П. Рэзнікава спынілася на пытаннях аховы здароўя працоўных у нашай краіне, а таксама дала студэнтам шмат добрых парад па гігіене разумовай працы.

Карыснай аказалася гутарка старшыні савета клуба універсітэта В. Літвінкі, які запрасіў замежных сяброў да ўдзелу ў канцэртах, арганізацыі маладзёжных вечароў. Характэрна, што пасля выступлення В. Літвінкі ў многіх студэнтаў падрыхтоўчага факультэта з'явілася цяга да мастацкай самадзейнасці. Адразу, як кажуць, выявіліся таленты.

Важным момантам у рабоце школы культуры з'яўляецца тое, што праслуханыя студэнтамі лекцыі, даклады, сустрэчы з савецкімі людзьмі—жывымі стваральнікамі новага жыцця, дапаўняюцца праглядам хранікальна-дакументальных і мастацкіх фільмаў, экскурсіямі на прадпрыемствы, у месцы адпачынку працоўных, школы, дзіцячыя сады, музеі, тэатры і іншыя. Аб гэтым добра было сказана самымі студэнтамі розных краін у папярэднім нумары нашай газеты.

Наперадзе яшчэ амаль два семестры, шмат гарачых спрэчак, дыскусій, цікавых сустрэч, культпаходаў. Але ўжо з поўнай падставай можна сказаць, што новыя студэнты, якія прыехалі да нас на вучобу, палюбілі сваю школу культуры, якая адкрывае ім новыя даляглады. Як гасцінныя гаспадары, мы рады паказаць нашым сябрам усё, што іх цікавіць, расказаць пра гісторыю барацьбы нашага народа, яго жыцці, працы, імкненні да міру, да дружбы з усімі міралюбівымі народамі свету.

Г. УЛАДЗІМІРАЎ.

# БІЁЛАГ НЕ МОЖА НЕ БЫЦЬ ФІЛОСАФАМ

Выкананне задач, якія вылучыла Прагарама КПСС перад савецкай біялогіяй, патрабуе распрацоўкі комплексу філасофска-біялагічных праблем.

Фактычны матэрыял, які накоплены ў пазнанні біясінтэза бялка нуклеінавых кіслот, у перадачы спадчынных уласцівасцей жывёл і раслін; у галіне генетычнай інфармацыі і ўльтраструктуры клеткі, будовы мікробаў, а таксама вялікае мноства іншых фактаў, прымушае нас падумаць і аб тым, што мы ўступілі ў эпоху рэвалюцыі ў біялогіі. Гэта ў сваю чаргу патрабуе, каб мы накіравалі на правільны шлях пазнання наша агульнатэарэтычнае мысленне.

Біялогія сярод розных шматлікіх галін ведаў займае асаблівае становішча. Гэтая асаблівасць абумоўліваецца перш за ўсё складанасцю прадмета даследавання. Вучонаму-біёлагу для рашэння біялагічных праблем недастаткова павярхоўнага знаёмства з матэрыялістычнай дыялектыкай. Яшчэ Ф. Энгельс падкрэсліваў, што дыялектыка становіцца абсалютнай неабходнасцю для прыродазнаўства.

Сярод біёлагаў яшчэ можна іншы раз пачуць, што і без філасофіі можна «рухаць» навуку. Вядома, дыялектычны метад не можа падмяніць асобныя метады, пры дапамозе якіх здабываюцца факты, скажам, у біяхімічнай навуцы, таму што ён сам па сабе не можа ні зрабіць новых фактаў, ні адкінуць тую альбо іншую гіпотэзу. Але ж дыялектычны метад прадухіляе аднабаковыя абагульненні, абсалютызацыю асобных гіпотэз, указвае правільны шлях рашэння наспеўшых пытанняў у сучаснай біялагічнай навуцы.

Даныя біяхіміі поўнасцю падцвярдзілі адзіна навуковы пункт гледжання на сутнасць жыцця, выстаўлены яшчэ Ф. Энгельсам, а потым развіты Ул. І. Леніным у творы «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм». Палажэнне аб матэрыяльнай сутнасці жыццёвых з'яў і пазнавальнасці іх сучасная біялогія не абвяргае, а канкрэтызуе. Цяпер ужо бясспрэчна ўстаноўлена, што акрамя бялкоў у праяўленнях жыцця маюць рашаючы голас і нуклеінавыя кіслоты, — дэзоксірыбануклеінавая (ДНК) і рыбануклеінавая (РНК). У працэсе канкрэтызацыі, як бачым, сама дыялектыка развіваецца.

Сучасная малекулярная біялогія свядома ці не свядома развівае дыялектычныя палажэнні аб тым, што нельга ставіць знак роўнасці паміж біяхімічнымі, хімічнымі і фізічнымі працэсамі, якія адбываюцца па-за арганізмам. Дыялектыка такая — біялагічныя працэсы адмаўляюць фізічныя і хімічныя, змяшчаюць іх у знятым выглядзе. У жывым арганізе яны змяшчаюць новую якасць, ідуць у пераапранутым выглядзе, згодна жывой сістэме, якая адмаўляе соматыўны характар гэтых працэсаў, уласцівы для нежывой прыроды, надаючы ім характар жыццёвай цэласнасці. Кожны дзень малекулярная біялогія прыносіць новыя і новыя факты, якія ўскрываюць складаны працэс адмаўлення біяхімічнымі працэсамі працэсаў фізічных і хімічных. Біялогія засноўваецца на дыялектыцы колькасных фізіка-хімічных змен у якасна новыя, біялагічныя.

Выпадковае выхопліванне асобных фактаў з агульнай прычыннавынікова́й сувязі з'яў прыводзіць іх да абсалютавання, а гэты шлях, як адзначыў Ул. І. Ленін, з'яўляецца адной з прычын развіцця антынавуковых поглядаў. Так здарылася, напрыклад, з некаторымі ўяўленнямі выдатнага канадскага патолага Ганса Селье.

Нашы веды аб жывым за апошнія дзесяцігоддзі зрабілі гіганцкі скачок. Але паміж старым і новым застаўся нейкі прагал, некаторая абсалютызацыя адных фактаў і забыццё іншых, таму задача не толькі ў вывучэнні жывога на «ультра»- узроўні, але і паўнейшай прычынна абумоўленай, навукова абгрунтаванай трактоўцы навейшых даных біялагічнай хіміі, біяфізікі, цыталогіі, генетыкі, мікрабіялогіі, фізіялогіі. Вырашыць гэтую задачу можна толькі абасноўваючы даныя біялогіі дыялектыкай.

*І. ДАЎГАЛЕВІЧ,*
*аспірант кафедры біяхіміі і біяфізікі.*

## МАЦНЕЕ НАША ТАВАРЫСТВА

**Днямі на геолага-геаграфічным факультэце адбылося пасяджэнне членаў Беларускага аддзялення Геаграфічнага таварыства СССР. На ім прысутнічаў і зрабіў цікавы даклад сакратар праўлення Беларускага грамадска - культурнага таварыства у Беластоку У. М. Юзвюк.**

**Створанае ў 1956 годзе таварыства мае сваёй мэтай праводзіць шырокую культурна-выхаваўчую працу сярод беларускага насельніцтва, якое жыве ў Польшчы. Як вядома, толькі ва ўсходніх паветах Беластокскага ваяводства жыве больш 100 тысяч беларусаў. Таму ўрад ПНР зацікаўлены ў правадзімай рабоце.**

**Таварыства налічвае ў сваіх радах каля шасці тысяч членаў, якія аб'яднаны ў 154 гурткі. Сяляне вельмі актыўна ўдзельнічаюць ва ўсіх мерапрыемствах, якія праводзяцца праўленнем. А такіх мерапрыемстваў многа: тут і прагляд савецкіх кінафільмаў, і абмен маладзёжнымі дэлегацыямі, кнігамі, газетамі, часопісамі, выступленнямі па радыё, паездкі канцэртных брыгад, гутаркі і даклады. У вёсках налічваецца каля 100 гуртkoў мастацкай самадзейнасці, якія часта наладжваюць выступленні перад сельскімі працаўнікамі, а створаны ў 1961 годзе мастацкі калектыў «Лявоніха» даў ужо каля 1300 канцэртаў.**

**Таварыства шмат увагі ўдзяляе азнаямленню беларускага насельніцтва з працоўнымі і культурнымі дасягненнямі нашай рэспублікі. Гэта робіцца не толькі праз газету «Ніва». Стараюцца запрасіць нашых лектараў, партыйных работнікаў, якія расказваюць пра жыццё Беларусі. Так, вельмі добра выступаў з лекцыямі пра сённяшнюю і заўтрашнюю Беларусь дацэнт геолага-геаграфічнага факультэта В. А. Навіцкі. Ён быў прыемна здзіўлены той высокай актыўнасцю, якая назіралася сярод працаўнікоў вёсак. На яго даклады, лекцыі прыязджалі сяляне з нават далёкіх вёсак і з цікаўнасцю слухалі.**

**Таварыства праводзіць і вялікую навуковую работу. Выдаюцца кнігі на беларускай мове, беларускія календары, навуковыя зборнікі і шмат іншага.**

**Цяпер члены праўлення таварыства распрацоўваюць мерапрыемствы, якія будуць праводзіцца да 50-годдзя Савецкай улады. Тут даклады і гутаркі пра БССР і СССР, абмен тэматычнымі фотавыстаўкамі, мастацкімі калектывамі.**

**Даклад У. М. Юзвюка выклікаў вялікую цікавасць у прысутных, аб чым сведчылі пытанні, якія былі зададзены прамоўцу.**

# ЭВМ НАЗНАЧАЕ СТЫПЕНДЫЮ

*Усе вы, напэўна, бачылі доўгія спісы курсавых стыпендыяльных камісій. І вось у такім складзе ім прыходзіцца засядаць па два-тры разы. Затым засядае факультэцкая стыпендыяльная камісія. І зноў доўгія гадзіны пасяджэнняў. На кожнага студэнта затрачваецца прыкладна адна чалавека-гадзіна працы стыпендыяльнай камісіі.*

*Зусім другая справа—электронная машына. Яе магчымасці і вырашыў выкарыстаць Я. Гаршкоў, яшчэ будучы старшынёй партбюро матфака. Цяжка, відаць, яму прыходзілася пры падрыхтоўцы спіскаў на атрыманне стыпендый. Трэба было даваць пэўную колькасць стыпендый кожнаму курсу і глядзець, каб гэтыя стыпендыі былі «аб'ектыўнымі». Але ўсё ж пры адных і тых жа адзнаках і матэрыяльным становішчы на адным курсе стыпендыю атрымоўвалі, а на другім не. Усе гэтыя недарэчнасці і прымусілі падумаць над вырашэннем задачы з дапамогай ЭВМ.*

*І вось першыя вопыты, першыя параўнанні. Назначалі стыпендыю паралельна курсавая камісія і машына. Электронная вылічальная машына назначала стыпендыю студэнтам, якім камісія не назначала. І як атрымалася пры разглядзе вынікаў факультэцкіх камісій, праўда была на баку машын «электроннага мозга». І вось летнюю стыпендыю ў гэтым годзе ўсяму матэматычнаму факультэту назначала ўжо машына.*

*Якія факты ўлічвае яна? Паспяховасць (выдатнікам яна адразу ж назаначае стыпендыю выдатніка), матэрыяльнае становішча. Прычым машына «разумее», што заработак у дзвесце сорак рублёў сям'і з васьмі чалавек лепш, чым заработак у 60 рублёў сям'і з двух чалавек, хоць там і там прыходзіцца па трыццаць рублёў на аднаго. Да гэтага яшчэ ўлічваецца і грамадская работа студэнта, яго ўдзел у спартыўным жыцці, у мастацкай самадзейнасці, ў навуковай працы. Машына бярэ пад сваю ўвагу і тое, жанаты вы ці халасцяк, выйшлі вы замуж ці не. І так улічваюцца яшчэ многія абставіны, вынікі друкуюцца на паперы ў выглядзе звычайнага пратаколу пасяджэння стыпендыяльнай камісіі. Праграма складаецца, як кажуць, «на ўсе выпадкі жыцця». Пры назначэнні стыпендыі ў верасні месяцы машына адначасова будзе размяркоўваць і месцы ў інтэрнаце.*

*ЭВМ падлічвае ўсё да драбніц. Сапраўды, калі ў аднаго студэнта, напрыклад, прыходзіцца на члена сям'і 40 рублёў, а ў другога 41 пры іншых роўных умовах, то першы атрымлівае стыпендыю ўвесь семестр, другі—некалькі месяцаў.*

*На маю думку, самае галоўнае ў тым, што электронна-вылічальная машына можа назначаць стыпендыю не толькі на факультэце, але і ва ўсім універсітэце. Дарэчы, усё гэта робіцца на працягу некалькіх хвілін. Такім чынам тут ёсць дзве відавочныя перавагі: вялікая эканомія часу для членаў размеркавальнай камісіі і аб'ектыўнасць назначэння стыпендыі.*

*Мы параіліся з грамадскімі арганізацыямі універсітэта і вырашылі, што ў новым семестры размяркоўваць стыпендыю будзем вылічальнай машынай для ўсяго універсітэта.*

*Г. ДРАБУШЭВІЧ.*

*НА ЗДЫМКУ: адзін з момантаў работы «электроннага мозга».*



## СПОРТ



**У мінулую нядзелю ў парку «Перамогі» быў праведзены агульнауніверсітэцкі крос, прысвечаны 50-годдзю Савецкай улады. Ва ўпартай барацьбе першае месца занялі студэнты — гісторыкі.**

**У мужчын на дыстанцыі 300 м. тры першыя месцы занялі Ф. Моненка (гістфак) — 8,29 мін., А. Іваністаў (фізфак) — 9,25,9 мін., А. Ланкоўскі (матфак) — 9,27,8 мін.**

**М. ЖАЎНЕРКА,**
**галоўны суддзя спаборніцтваў.**

## САРДЭЧНАЯ ПАДЗЯКА

*Рэктару Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна.*

*Сакратару парткома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна.*

**Партыйная, прафсаюзная арганізацыі, а таксама рабочыя саўгаса «Новыя Зялёнкі» Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці дзякуюць студэнтам 2-га курса юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна за старанную і дабрасумленную іх працу на ўборцы бульбы.**

**За час, праведзены ў саўгасе, студэнты пад кіраўніцтвам выкладчыка А. Т. Лейзерава, аказалі вялікую дапамогу нашай гаспадарцы. Група ў цэлым праявіла высокую дысцыплінаванасць, культуру, улюбёнасць да працы.**

*Дырэктар саўгаса «Новыя Зялёнкі»*
*І. КАКОВІЧ,*
*Сакратар партбюро К. КРУК,*
*Старшыня рабочага камітэта Ул. МАРОЗ.*

